ЧЭРВЕНЬСКІЯ ПЕРАПЕВЫ



Па гарызанталі: 1. «І ... спелаю суніцай // У стоме хіліцца за бор». З верша А. Мінкіна «Чэрвень». **6.** Касі, каса, пакуль раса, раса далоў, ... дамоў (*прык.*). **8.** «Але касьба — ... лету». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» («Летнім часам»). **9.** Які чэрвень — такое і ... (*прык.*). **10.** Мужыку ... — што святому рай (*прык.*). **12.** Свецкае імя беларускай асветніцы XII стагоддзя Ефрасінні Полацкай: 5 чэрвеня — дзень яе памяці. **15.** Устройства для дэманстрацыі фільмаў. **16.** «У чым сэнс жыцця? Служыць іншым і рабіць ...». Арыстоцель. **17.** Прылада для догляду адзення; 6 чэрвеня — нарадзіўся электрычны .... **18.** У чэрвені ... з зарою сходзяцца (*прык.*). **21.** Старажытнарымская багіня шлюбу і сям'і, ад імя якой утварылася руская назва чэрвеня — «июнь». **22.** У чэрвені свята ў бары : цвітуць ... і елка (*прык.*). **27.** Травяное покрыва лугоў. **29.** ... ды лебяда — для палетка бяда (*прык.*). **30.** Лёгкая лодка. **31.** ... ў хляве — малачко на стале (*прык.*); 1 чэрвеня — Сусветны дзень малака і Міжнародны дзень абароны дзяцей. **32.** У каго ..., у таго і галоўка гладка (*прык.*). **33.** «Калі да сэрца зноў прытуліш // Сваё дарослае ..., // Нібы ўваскрэсне з небыцця // Маё дзяцінства». З верша Дз. Пятровіча «Матулі светлае імя».

Па вертыкалі: 1. Спатканне. **2.** Вершаваная страфа з дзевяці радкоў. **3.** Хата з дзецьмі — ..., без дзяцей — магіла (*прык.*). **4.** Невялікі пакаёвы сабака. **5.** «Муха сена к возу носіць, // А ... складае». З прыпеўкі. **7.** «Свеціць ласкай з высі агнявое сонца, // Хараства красою... ўвесь адзяе...» А. Гурло. **11.** Вясёлае слова — гутаркі ... (*прык.*). **13.** ... — за талерачку, а гаспадар — за гарэлачку (*прык.*); 8 чэрвеня — Міжнародны дзень хатніх гаспадара і гаспадыні. **14.** Пушны драпежны звярок, у якога, як і ў мядзведзя ды барсука, у чэрвені адбываецца «вяселле» (гон). **19.** Невялікае судна. **20.** Вялікі музычна-драматычны твор. **23.** ... бяды не чыніць (*прык.*). **24.** Бацька за ... — дзеці за пірог (*прык.*). **25.** Асобны прадмет. **26.** Як малое падае, то анёл з пярынкаю, а як старое, то... з бараною (*прык.*). **28.** Малыя дзеці — ... баляць, вялікія — сэрца баліць (*прык.*).

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.
г. Дзяржынск.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 1. Сонца. **6.** Касец. **8.** Пачатак. **9.** Сена. **10.** Лета. **12.** Прадслава. **15.** Экран. **16.** Добро. **17.** Прас. **18.** Зара. **21.** Юнона. **22.** Сасна. **27.** Трабастоп. **29.** Аст. **30.** Бер. **31.** Карэўка. **32.** Матка. **33.** Дзіця.

Па вертыкалі: 1. Сустрэча. **2.** Нона. **3.** Базар. **4.** Такса. **5.** Камар. **7.** Свет. **11.** Аснова. **13.** Гасцяўніна. **14.** Гарнастай. **19.** Шлюпка. **20.** Араторыя. **23.** Заяц. **24.** Пароп. **25.** Штука. **26.** Чорт. **28.** Рукі.

СЁННЯ

Месяц

Поўня 4 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Вадаліва.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.40	21.37	16.57
Віцебск —	4.22	21.35	17.13
Магілёў —	4.30	21.27	16.57
Гомель —	4.36	21.15	16.39
Гродна —	4.57	21.51	16.54
Брэст —	5.07	21.42	16.35

Імяніны

Пр. *Івана, Ферапонта.*
К. *Яўгеніі, Адрыяна, Антонія, Густава, Роберта, Яраслава.*

Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

ЗАЎТРА



Даты | Падзеі | Людзі

7 ЧЭРВЕНЯ

У краіне

1563 год — вялікі князь ВКЛ Жыгімонт II Аўгуст падпісаў новы прывілей аб ураўнаванні ў правах праваслаўных і каталікоў. Тэкст прывілея ўключаны ў якасці прэамбулы ў Статут Вялікага Княства Літоўскага 1566 года.

1923 год — нарадзіўся (Клімавіцкі раён) Міхаіл Антонавіч Старавойтаў, Герой Савецкага Саюза. У гады Вялікай Айчыннай вайны — на Заходнім, Паўднёва-Заходнім, Стэпавым, 3-м Украінскім франтах. Аўтаматчык радавы Старавойтаў вызначыўся ў 1944-м у баях на тэрыторыі Адэскай вобласці, дзе пасля фарсіравання Паўднёвага Буга на захопленым плацдарме ўдзельнічаў у адбіцці дзевяці варожых контратак, пяць разоў хадзіў у атаку, у рукапашным баі знішчыў сем гітлераўцаў. Памёр ад ран у 1944-м.

1958 год — пачата будаўніцтва першынца беларускай нафтахіміі — нафтаперапрацоўчага завода, закладзены горад Наваполацк.

1963 год — нарадзілася Галіна Леанідаўна Левіна, беларускі архітэктар. Сярод работ (у суаўтарстве): у Мінску — помнік ахвярам мінскага гета на плошчы Юбілейнай, другая чарга комплексу адміністрацыйных будынкаў Міжнароднага агульнаадукацыйнага цэнтра на праспекце газеты «Праўда», рэканструкцыя і добраўпарадкаванне плошчы Давыда ў Давыд-Гарадку і іншае. Аўтар праектаў рэканструкцыі помнікаў архітэктуры XVII—XIX стагоддзяў у Мінску, Валожыне, Полацку і іншых гарадах. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2003).

У гэты ж год нарадзіўся Яўген Мікалаевіч Далінін, беларускі спартсмен (дзюдо, самба), майстар спорту СССР міжнароднага класа, заслужаны майстар спорту Беларусі. Чэмпіён, бронзавы прызёр чэмпіянатаў свету па самба, бронзавы прызёр чэмпіянатаў Еўропы па самба. Сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы па дзюдо сярод паліцэйскіх.

У свеце

1848 год — нарадзіўся Поль Гаген, французскі жывапісец, адзін з галоўных прадстаўнікоў постімпрэсіянізму.

1933 год — нарадзіўся Аркадзь Міхайлавіч Арканаў (сапр. Штэйнбок), расійскі пісьменнік-сатырык, драматург.

1938 год — нарадзіўся Аляксандр Аляксандравіч Дольскі, расійскі паэт, музыкант, выканаўца, заслужаны артыст РСФСР. Аўтар песень да фільмаў «Старэйшы сын», «Тракцір на Пятніцкай».

У гэты ж год нарадзілася Таццяна Яўгенаўна Лаўрова, расійская артыстка тэатра і кіно, народная артыстка РСФСР.

1958 год — нарадзіўся Прынс (Прынс Роджэрс Нэльсан), амерыканскі спявак, танцор, кампазітар і акцёр. Лаўрэат прэмій «Грэмі», «Оскар» і іншых. У 2004-м яго імя было занесена ў Залу славы рок-н-рола.

Так гаварыў...

СЕНЕКА:

«Шануй тых, хто імкнецца здзейсніць нешта вялікае. Нават калі ім гэта не ўдалося».

УСМІХНЕМСЯ

Вы таксама заўважылі, што сабачнікі ніколі не гавораць сваім дзецям: «Малыш, ідзі пабегай па траўцы...»?

На заводзе інструктаж па тэхніцы бяспекі. Інжынер па ТБ:

— І ў канцы хачу сказаць, што выява таго, хто не выконвае на працы ТБ, будзе...

Тут умешваецца нейкі жартаўнік:

— Змешчана на дошку гонару?

Інструктар:

— Не, будзе намалявана ў поўны рост... мелам... на падлозе цэха.

— А ты даўно кактус на халадзільніку паліваў?

— Гэта хлеб...

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 10.363. Індэкс 63850. Зак. № 1380. Нумар падпісаны ў 19.30 6 чэрвеня 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12